

ВЫБІРАЕМ НАСЕННУЮ БУЛЬБУ 4

ПРА СПРАЎДЖАНЫЯ МАРЫ І АДЧУВАННЕ ПАЛЁТУ 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

12 КРАСАВІКА 2024 г. ПЯТНІЦА № 73 (30207)

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ГЭТА НЕ ПРОСТА ІМІДЖ. ГЭТА НАЙВЯЛІКШАЯ ПЕРАМОГА НАШАЙ КРАІНЫ»

## Марына Васілеўская — Герой Беларусі

**Першы касманаўт суверэннай Беларусі Марына Васілеўская — дома! У чацвер яна вярнулася ў Беларусь і адразу з аэрапорта, дзе яе радасна і ўрачыста віталі, накіравалася на сустрэчу з Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам. У Палацы Незалежнасці прайшла цырымонія ўшанавання беларускіх касманаўтаў і ўсіх, хто ўнёс значны ўклад у пакарэнне космасу беларусамі.**





Фота БелТА.

Марыне Васілеўскай прысвоена званне «Герой Беларусі». Старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір Гусакоў узнагароджаны ордэнам Пашаны, генеральны дырэктар ААТ «Авіякампанія «Белавія» Ігар Чаргінец — медалём «За працоўныя заслугі». Падзяка Прэзідэнта аб'яўлена Івану Бучы, намесніку начальніка ўпраўлення аэракасмічнай дзейнасці Нацыянальнай акадэміі навук, і Анастасіі Лянковай, касманаўту Рэспублікі Беларусь. Падзячныя лісты Прэзідэнта Аляксандр Лукашэнка ўручыў таксама бацькам Марыны Васілеўскай і Анастасіі Лянковай.

«Апошнія два тыдні мы жылі адным лозунгам, адной ідэяй «Космас наш!». Усе мы аб гэтым думалі, аб гэтым марылі — здзейснілася. З гэтымі словамі праводзілі і сустракалі першага ў гісторыі суверэннай нашай незалежнай Беларусі касманаўта — Марыну Васілеўскую, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Вядома, мы ганарымся нашымі землякамі — усімі, хто ў розныя гады прыносіў славу сваёй Радзіме, развіваючы касмічныя тэхналогіі і пакараючы космас. Мы з асаблівай цеплынёй радуемся поспехам нашага суайчынніка Алега Навіцкага». Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што Алег Навіцкі зрабіў усё, каб Марына здолела адаптавацца да складаных умоў і нестандартных задач.

«Яе палёт — гэта новы ўзровень удзелу ў касмічных праграмах, паўтару, суверэннай Беларусі і новы ўзровень саюзных, вельмі добрых, брацкіх адносін Беларусі і Расіі і нашых народаў. Сімвалам брацкай сувязі нашых народаў сталі дзяржаўныя сцягі, разгорнутыя на вышыні больш за чатырыста кіламетраў ад нашай планеты», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што за палётам Марыны з заміраннем сэрца сачылі ўсе, усе захапляліся смеласцю і мэтанакіраванасцю сваёй суайчынніцы. Але, па словах Прэзідэнта, мы можам ганарыцца ўсімі дзяўчатамі — удзельніцамі касмічнага праекта. Першачаткова іх было больш за дзве тысячы. Пасля палёту Марыны іх стала яшчэ больш, гатовых зрабіць гэты крок. «Усе яны годныя, нацэленыя выпрабаваць грані сваіх магчымасцяў і апраўдаць чаканні мільёнаў беларусаў. Шчыра дзякую кожнай. Вы разумніцы і прыгажуні, сапраўдныя патрыёткі Беларусі», — сказаў ён.

СТАР. 2

## *Кранальныя моманты сустрэчы ў аэрапорце*










Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.



ISSN 1990 — 763X

24073

9 771990 763008

### КОРАТКА

• **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка назначыў членамі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу восьмага склікання Леаніда Зайца, Сяргея Хаменку і Уладзіслава Татарыновіча. Адпаведныя ўказы кіраўнік дзяржавы падпісаў 11 красавіка. У адпаведнасці з дакументамі Леанід Заяц і Сяргей Хаменка вызвалены ад пасад намесніка прэм'ер-міністра і міністра юстыцыі адпаведна.**

• Прэм'ера ваенна-гістарычнай драмы «Час вярнуцца» адбудзецца 2 мая. Кінакарціна прысвечана 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

• **БелАЗ прэзентаваў навінкі тэхнікі: газавы і электрычны самазвалы.**